Эмануіл ІОФЭ

НОВАЕ ПРА ЎЗАЕМАСУВЯЗІ ДЫЯСПАР ДВУХ СЛАВЯНСКІХ НАРОДАЎ

Адной з самых маладаследаваных і складаных праблем сусветнай гістарычнай навукі з'яўляецца праблема гісторыі, культуры і ўзаемасувязей дыяспар.

Тэрмін «дыяспара» паходзіць ад грэчаскага слова «diaspora» (рассейванне). Што да беларускай дыяспары, то маецца на ўвазе сталае, доўгатэрміновае ці часовае пражыванне значнай часткі народа (этнічнай супольнасці) па-за дзяржавай (гістарычнай тэрыторыяй) свайго пражывання. Мала каму вядома, што з канца XIX стагоддзя да 1980-х гадоў дыяспара ахоплівала ад шостай да амаль трэцяй часткі беларускай нацыі. У пачатку 1990-х за межамі Рэспублікі Беларусь пражывала ад 3 да 3,5 млн. беларусаў.

27 ліпеня 1990 года была прынята Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР, 25 жніўня 1991 года ёй быў нададзены канстытуцыйны статус, а 10 снежня таго ж года Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў пастанову «Аб дэнансацыі дагавора 1922 года аб утварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік». У сувязі з працэсам набыцця незалежнасці Беларусі пачаліся істотныя змены на дзяржаўным узроўні ў дачыненні да нацыянальнай дыяспары.

Праявамі новага стаўлення з'явіліся непасрэдныя кантакты беларусаў замежжа з кіраўніцтвам нашай рэспублікі, што было немагчыма за ўвесь пасляваенны перыяд.

Усё гэта прывяло да ўзрастання цікавасці беларускай моладзі і шырокіх колаў грамадскасці нашай краіны да гісторыі і культуры беларускай дыяспары і яе ўзаемасувязей з дыяспарамі іншых славянскіх краін.

Менавіта ў гэтым асноўная прычына актуальнасці выхаду ў свет манаграфіі маладога беларускага вучонага-гісторыка Вольгі Коваль «Узаемасувязі беларускай і ўкраінскай дыяспар у міжваенны перыяд».

Гэта першае ў свеце выданне на 314 старонак (менавіта кніга, а не артыкул), спецыяльна прысвечанае разгляду ўзаемасувязей беларускай і ўкраінскай дыяспар у 1918—1939 гадах, а дакладней — 22 гадам міжваеннага перыяду. Прыемна здзіўляе велізарная база крыніц, многія з якіх уведзены ў навуковы зварот упершыню.

Аўтарка падкрэслівае: «Падчас вывучэння ўзаемасувязей беларускай і ўкраінскай дыяспар былі выкарыстаны разнастайныя гістарычныя крыніцы замежных і айчынных архіваў і бібліятэк, у тым ліку перыядычныя выданні міжваеннага часу. Каштоўнай гістарычнай крыніцай пры вывучэнні мінулага беларускай эміграцыі стала прэса замежжа...

Самая багатая калекцыя прэсы беларускай дыяспары працяглы час захоўвалася ў нацыянальным навукова-асветніцкім цэнтры імя Францыска Скарыны, заснаваным у 1991 годзе ў Мінску...

Для апісання ўзаемасувязей дыяспар былі выкарыстаны архіўныя дакументы эміграцыйных арганізацый, польскіх дзяржаўных эміграцыйных органаў, прыватнае ліставанне і мемуары эмігрантаў з фондаў беларускіх, украінскіх і польскіх архіваў, а таксама неапублікаваныя дакументы ЦДАВО Украіны, у тым ліку каштоўныя матэрыялы былога ўкраінскага «Пражскага архіва», дзе сустракаецца інфармацыя пра дзейнасць беларускай эміграцыі...»

Заслугоўвае ўвагі чытачоў хоць і адносна кароткі, але даволі грунтоўны і аб'ектыўны аналіз гістарыяграфіі даследаванняў. Галоўная асаблівасць гэтага аналізу і ўсяго тэксту манаграфіі наогул — гэта ажыццяўленне прынцыпу «Платон мне сябра, але ісціна даражэй». Так, Вольга Коваль адзначае: «Сярод беларускіх матэрыялаў сучасных даследчыкаў вылучаюцца навуковыя работы, падрыхтаваныя беларусамі замежжа. Для большасці гэтых прац характэрна аднабаковасць ацэнак. Самі беларускія эмігранты сваю дзейнасць і работу папярэднікаў характарызуюць выключна станоўча, часта перабольшваюць яе значэнне і маштабы».

У адрозненне ад пераважнай большасці навуковых прац па гісторыі і культуры беларускай і ўкраінскай дыяспар даследчыца ўдзяліла ўвагу асноўным дэфініцыям і вызначэнням тэрміналогіі. Гэтаму прысвечаны другі параграф першага раздзела кнігі. Нельга не згадзіцца з думкамі Вольгі Коваль, што пры вывучэнні беларускай і ўкраінскай дыяспар міжваеннага часу неабходна карыстацца паняццем «сувязь», бо ўзаемадзеянні былі абумоўлены глыбокімі аб'ектыўнымі і суб'ектыўнымі фактарамі: агульнай гісторыяй, падабенствам моў, сацыякультурных традыцый і г. д. Сувязі паміж беларусамі і ўкраінцамі за мяжой мелі двухбаковы характар, аднак для беларусаў яны былі больш важнымі, чым для ўкраінцаў.

У аўтаркі маюцца ўсе падставы для высноў, што на сучасны момант актыўна распрацоўваецца тэрмін «комплекс эмігранта», што прадстаўнікам слаба кансалідаванай беларускай дыяспары было складаней пераадольваць псіхалагічны бар'ер комплексу эмігранта, чым украінцам замежжа. Мацнейшая ўкраінская дыяспара мела шэраг механізмаў захавання сацыяльнай памяці, якія выконвалі абарончую для псіхікі функцыю.

Значную навуковую каштоўнасць мае «Дадатак» да кнігі (с. 300—313), у якім змешчаны 13 табліц.

Я ўжо адзначаў, што праз усю манаграфію чырвонай ніткай праходзіць імкненне да аб'ектыўнасці. На першы погляд, іншы беларускі даследчык паказаў бы перавагу беларускіх перасяленцаў над украінскімі. Інакш дзейнічае Вольга Коваль. Указваючы на шэраг агульных рыс эканамічнай міжваеннай украінскай і беларускай эміграцыі, яна акцэнтуе ўвагу чытачоў, што ўкраінскія перасяленцы паміж сусветнымі войнамі прадстаўлялі больш колькасную і кансалідаваную супольнасць, чым беларусы замежжа. Даследчыца правамерна канстатуе, што на палітызацыю ўкраінскай дыяспары моцны ўплыў аказвалі разнастайныя партыі, грамадскія аб'яднанні і саюзы. У адрозненне ад беларусаў, украінскія эканамічныя эмігранты намагаліся працяглы час захоўваць у розных краінах свету кантакты з радзімай, уласную нацыянальную адметнасць, мову і культуру.

Адзін з самых прынцыпова важных параграфаў другога раздзела і ўсёй манаграфіі ў цэлым носіць назву «Роля беларускай палітычнай эміграцыі ў жыцці дыяспары». Як бы то ні было, даследчыца павінна прызнацца чытачам, што гісторыя палітычных беларускіх мігрантаў у сучаснай гістарыяграфіі прадстаўлена нязначна і аднабакова. Фактычна нявывучаным застаецца міжваенны перыяд. Трэба валодаць навуковай смеласцю, каб падкрэсліць, што большасць навуковых даследаванняў канца 90-х гадоў XX стагоддзя адрозніваецца ідэалагічнай заангажаванасцю, шматлікія публікацыі па дадзенай тэме трэба аднесці да публіцыстыкі. Нельга не згадзіцца з Вольгай Коваль, што асноўнай праблемай для даследчыкаў гісторыі эміграцыі з'яўляецца слабая крыніцазнаўчая база, таму многія навукоўцы ў сваіх публікацыях выкарыстоўваюць успаміны і мемуары беларускіх эмігрантаў, што прыводзіць да памылковых высноў. Так, на самай справе, спрэчнымі застаюцца маштабы эміграцыйных хваль, вызначэнне ролі палітычных арганізацый і партый, неадназначнай з'яўляецца ацэнка дзеячоў замежжа.

Аўтар манаграфіі вымушана прызнаць, што беларускія палітычныя эмігранты ў міжваенны час праявілі раз'яднанасць, няздатнасць да кансалідацыі, што негатыўна адбілася на палітычным жыцці ўсёй дыяспары.

Шмат новых думак, высноў, фактычнага матэрыялу змяшчае ў сабе трэці раздзел манаграфіі З трох параграфаў гэтага раздзела маладому чытачу найбольш цікавым будзе параграф «Студэнцкія і навуковыя сувязі беларускай і ўкраінскай дыяспар».

Відаць, не кожнаму чытачу знаёмы адзін з фактаў, прыведзены на 192 старонцы кнігі: «З-за адсутнасці беларускіх школ і ўніверсітэтаў у прымаючых краінах беларусы нярэдка набывалі сярэднюю і вышэйшую адукацыю ва ўкраінскіх навучальных установах. Украінскія школы, інстытуты, акадэміі, універсітэты, навуковыя гурткі мелі шырокія магчымасці ў заходніх краінах, дзейнічалі дастаткова працяглы час, развівалі кантакты з буйнейшымі адукацыйнымі цэнтрамі ў Еўропе. Сярод выкладчыкаў украінскіх навучальных устаноў былі асобы з сусветнымі імёнамі ў галіне навукі і педагогікі. Асаблівасцю іх сістэмы адукацыі было пазітыўнае стаўленне да прыняцця ў студэнты беларускіх юнакоў і дзяўчат».

У гэтым параграфе чытачы пазнаёмяцца з цікавымі біяграфічнымі звесткамі пра беларускіх нацыянальных і палітычных дзеячоў — Тамаша Грыба, К. Дуж-Душэўскага, Івана Геніюша і іншых.

На 117—118-й старонках адзначаецца, што пасля прыходу да ўлады нацыстаў у працэсе падрыхтоўкі Германіі да Другой сусветнай вайны гітлераўцы вырашылі выкарыстаць эмігрантаў у калабарацыйнай дзейнасці. У 30-я гады XX стагоддзя становішча беларускіх палітычных эмігрантаў у Германіі паляпшаецца, іх пражыванне ў краіне легалізуецца, пачынаюць фінансавацца іх арганізацыі і мерапрыемствы. У газеце «Беларускі фронт» ад 1 студзеня 1939 года адзначалася, што ў Германіі 1 снежня 1938 года ўтварыўся Камісарыят для Украінскіх спраў. 1 студзеня 1939 года меркавалі адкрыццё падобнага Камісарыята для Беларускіх спраў. Вольга Коваль аб'ектыўна адзначае, што большасць прадстаўнікоў беларускай палітычнай эміграцыі ў Германіі з энтузіязмам уключыліся ў работу на баку нацыстаў. Разам з тым яна не называе ніводнага прозвішча прадстаўнікоў беларускай дыяспары за мяжой, якія ў 1930-я гады пачалі актыўна супрацоўнічаць з нацыстамі, а ў час Вялікай Айчыннай вайны занялі высокія пасады ў нямецкай акупацыйнай адміністрацыі ў генеральнай акрузе «Беларусь» рэйхскамісарыята «Остланд».

Нагадаем толькі два прозвішчы. Так, Знешнепалітычнае бюро нацысцкай партыі (АПА) пад кіраўніцтвам Альфрэда Розэнберга яшчэ летам 1933 года ўстанавіла кантакт з Фабіянам Акінчыцам — ідэолагам і лідарам невялікай групы беларускіх нацыянал-сацыялістаў. У лістападзе 1933 года пры падтрымцы і на грошы АПА прыступіла ў Вільні да выдання газеты «Новы шлях». Амаль адначасова, дзякуючы намаганням Акінчыца, у Берліне быў створаны Саюз беларускіх студэнтаў. Але гэтыя спробы не прыносілі спадзяваных вынікаў. Саюз студэнтаў з-за невялікай колькасці беларусаў у нямецкіх навучальных установах не змог разгарнуць шырокай дзейнасці, а тыраж «Новага шляху» не перавышаў 500 экзэмпляраў, што гаварыла пра невысокую яго папулярнасць. У 1938 годзе Фабіян Акінчыц пераехаў у Германію і стаў кіраўніком беларускага бюро Міністэрства прапаганды.

Адзін з лідараў беларускай дыяспары ў Празе Іван Ермачэнка з мэтай надаць сваёй місіі характар гістарычнай і палітычнай легітымнасці заручыўся падтрымкай Васіля Зазаркі — старшыні Рады БНР у эміграцыі. Амаль адразу пасля акупацыі Чэхіі немцамі (20 красавіка 1939 года) Ермачэнка падрыхтаваў на імя Гітлера мемарандум, лейтматывам якога была просьба вырашыць беларускае пытанне шляхам расчлянення СССР. Вядома, што гэты мемарандум не застаўся без увагі, пра што сведчыць запрашэнне Ермачэнкі і Захаркі (які толькі падпісаў гэты дакумент) на канферэнцыю ў МЗС Германіі (Берлін, 3 жніўня 1939 года). У ходзе гэтай канферэнцыі абодва дзеячы беларускай эміграцыі атрымалі абяцанні, што Германія «выступае супраць канцэпцыі адзінай і недзялімай Расіі». У далейшым гэтыя кантакты вельмі моцна паўплывалі на кар'еру Ермачэнкі ў нямецкай акупацыйнай адміністрацыі на тэрыторыі Беларусі. У кастрычніку 1941 года ён стаў прэзідэнтам Цэнтральнага савета Беларускай народнай самапомачы, а потым генеральным камендантам Корпуса беларускай самааховы.

Гэтыя заўвагі не зніжаюць навуковай каштоўнасці манаграфіі. Адна з асноўных задач, што стаіць перад сучаснымі гісторыкамі, — вярнуць спадчыну эміграцыі ў нацыянальную культурную скарбніцу».